чие, деньги, которые занимают в ценностной иерархии первые три места. Одновременно стали более значимыми такие жизненные ценности, как повышение профессионального уровня, надежда на случай, удачу, везение. Резко снизился также интерес к политике. Представляя свое будущее, большинство молодежи проявляет прагматический подход. Практически каждый второй студент ищет возможность подработать. Современная молодежь более рациональна по сравнению с предыдущими поколениями.

Таким образом, на фоне существующих проблем молодежи просто необходима единая идея осознания себя как социального слоя со своими требованиями, правами, мнениями. Эта идея должна сочетать в себе как осознание молодыми людьми самих себя, так и их имидж в глазах иных социальных слоев. Задача реализации этой идеи ложится на плечи как самих юношей и девушек, так и государства и СМИ.

**Литература**

1. *Иоффе Э. Г.* Студенческая молодежь Беларуси как субъект социальных действий // Народная асвета. 2002. № 8. С. 47.

# ПЕРСАНІФІКАЦЫЯ Ў СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫЦЫ

**Г. А. Паплаўская**

Аналізуючы стан сучаснай літаратурнай крытыкі, нельга не заўважыць нарастанне ў ёй суб’ектыўнай мадальнасці, якая апошнім часам нярэдка становіцца дамінантай тэксту. Вынікам такой тэндэнцыі стала так званая «персаніфікацыя» або персаналізацыя дзейнасці журналіста наогул і крытыка, у прыватнасці. Да аўтарызаванай крытыкі звяртаюцца як маладыя, так і сталыя літаратары. Маладыя – каб найбольш ярка заявіць пра сябе; сталыя – каб падзяліцца досведам пражытых гадоў.

Актуальнасць прапанаванай тэмы абумоўлена недастатковай распрацаванасцю яе ў беларускай філалогіі. Да праблем наяўнасці аўтарскага «я» ў публіцыстыцы звярталіся вядомыя беларускія і рускія даследчыкі: прафесары М.Цікоцкі, В.Іўчанкаў, Р.Салганік, С. Смятаніна і інш.

Аб’ектам даследавання ў рабоце з’яляецца літаратурная крытыка пісьменніка Леаніда Галубовіча (матэрыялы яго аўтарскай рубрыкі «ЛеГалІЗАЦЫЯ» ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва»).

Прадмет даследавання – стылістычныя асаблівасці, паводле якіх можна меркаваць пра ступень перасаніфікаванасці твораў Л. Галубовіча.

Мэта работы – праз выяўленне спецыфікі стылю пісьменніцкай крытыкі Леаніда Галубовіча раскрыць з’яву персаніфікацыі ў сучасным літаратурным працэсе.

Навізна работы заключаецца ў тым, што ў ёй робіцца спроба вызначыць у сучаснай літаратурнай крытыцы ролю персаніфікацыі як суб’ектыўнага фактару лінгвістычнай арганізацыі тэксту.

«Адной з асноўных тэндэнцый функцыянавання сучаснай айчыннай журналістыкі з’яўляецца «персаніфікацыя» журналісцкіх тэкстаў», – заўважае Кацярына Выраўцава [1, с. 90]. Даследчыца аналізуе рускія СМІ, але аналагічны працэс аўтарызацыі назіраецца і ў беларускай журналістыцы. Пра гэта, акрамя непасрэдна моўна-стылістычнага афармлення журналісцкіх тэкстаў, сведчаць фотаздымкі, якімі ілюструюцца артыкулы, вялікая колькасць аўтарскіх праграм на радыё і тэлебачанні, аўтарскія калонкі ў папяровых і электронных СМІ.

Персаніфікацыя (ад лац. persona – асоба і facio – раблю ) ці аўтарызацыя – стылістычны прыём вядзення журналістам гутаркі ад свайго імя, прысутнасць у тэкстах аўтарскага «я».

У лінгвістычнай літаратуры персаніфікацыя разглядаецца ў якасці асаблівага віду ўвасаблення, «імпліцытнае значэнне якой раскрываецца па прымеце поўнага прыпадабнення неадушаўлёнага прадмета чалавеку. У такім выпадку адбываецца не частковая інтэграцыя неадушаўлёны прадмет = прымета чалавека, а поўная (неадушаўлёны прадмет = чалавек), г. зн. прадмет набывае рэальны чалавечы воблік» [2, с. 162]. У гэтай працы тэрмін персаніфікацыя ўжыты ў першым значэнні і семантычна рэдуплікуецца з паняццямі аўратызацыя, персаналізацыя.

Аўтарызаваная літаратурная крытыка сёння – хутчэй заканамернасць, чым выключэнне з правіла. Імкненне да апелятыўнасці і экспрэсіўнасці з’яўляецца асновай развіцця сучаснай крытыкі. Крытыкі, якія не адчуваюць неабходнай запатрабаванасці ў чытацкай аўдыторыі, адыходзяць ад састарэлых канонаў разгляду твора, якія скляліся яшчэ ў савецкія часы, намагаюцца разнастаіць свой тэкст не толькі праз розныя спосабы падачы матэрыялу, але і праз форму, а таксама новую манеру моўна-стылістычнай арганізацыі тэксту.

Высокачастотнымі ў крытычных тэкстах з’яўляюцца прамыя звароты да чытача, імкненне абудзіць зваротную рэакцыю. Калі такія сродкі становяцца нядзейснымі, то крытыкі (прафесійныя або крытыкі-пісьменнікі) ствараюць максімальна правакацыйныя тэксты. У «Літаратуры і мастацтве» заўзятарам такіх вынаходніцтваў ёсць загадчык аддзела крытыкі Леанід Галубовіч.

Леанід Галубовіч – асоба неадназначная, але даволі цікавая. Ён піша, арыентуючыся як на людзей сталага веку, так і на моладзь. Ён умее

ЛеГалізаваць востра, асобасна і нярэдка палемічна. Не дзіва, што менавіта яго артыкулы становяцца прычынай з'яўлення на старонках ЛіМа шэрагу артыкулаў-адказаў.

Вызначаючы жанр твораў Л. Галубовіча, можна канстатаваць, што яго крытыка – відазмененая кароткая рэцэнзія з элементамі «бліц-крытыкі», якая вызначаецца надзвычай суб'ектыўнай экспрэсіяй і характаразуецца эмацыйнай рэфлексіяй на разглядаемыя тэксты.

Адной з фундаментальных катэгорый мовы з'яўляецца граматычная асоба. Яна афармляе ўдзел гаворачага ў маўленні, фарміруе ў многім яе будову. Усе артыкулы крытыка-пісьменніка Л. Галубовіча пабудаваны па схеме І тыпу маўлення. Усе выказванні крытыка – ад 1-ай асобы, што з'яўляецца асноўным паказчыкам персаніфікацыі: «Яшчэ вясной прынёс мне Юрась Нераток свой рукапіс вершаў, а заадно папрасіў напісаць прадмоўку да яго. Я прачытаў, накрэсліў свае заўвагі…» (ЛіМ, 12 снежня 2003 г.)

Выказванні з пабочнымі словамі і канструкцыямі, якія часта ўжывае ў артыкулах Л. Галубовіч, таксама адносяцца да І тыпу маўлення. Пабочныя словы, словазлучэнні даюць дадатковую суб'ектыўна-ацэначную інфармацыю. З іх дапамогай можна:

- выразіць розную ступень перакананасці выказанай думкі – упэўненасць, няўпэўненасць, сумненне, меркаванне: «Мабыць, дарэшты стаміла і сама літаратурная праца і бесперапыннае асэнсаванне самой літаратуры» (ЛіМ, 9 студзеня 2004 г.);
- выказаць адносіны да спосабу выражэння думак, да манеры выказвання, выбару стылю маўлення, паведамлення: «Адным словам, напісалі паэты са Светлагорска цэлыя кніжкі санетаў і нават вянкі вянкоў санетаў» (ЛіМ, 13 лютага 2004 г.);
- даць эмацыянальную ацэнку фактам, пра якія паведамляецца, выразіць радасць, задавальненне, захапленне, гонар, засмучэнне, здзіўленне, шкадаванне: «Як ні дзіўна, застаўшыся нарэшце сам-насам у сваёй краіне са сваім нацыянальным клопатам, мы сталі ўсё ўсё больш разрозненымі і аддаленымі ад галоўнай нацыянальнай ідэі – захавання адзінства ў разрэжанай беларускамоўнай прасторы нашай дзяржавы…» (ЛіМ, 19 снежня 2003 г.);
- указаць на крыніцу паведамлення, на тое, каму належаць думкі: «Пакуль жа ў яго, як кажуць, вершы на аматара» (ЛіМ, 23 студзеня 2004 г.);
- устанавіць лагічныя адносіны паміж часткамі выказвання, паказаць на крыніцу паведамлення, парадак думак, іх паслядоўнасць: «Зрэшты, прыхаваем сваю атрутную рэўнасць да больш паскуднай літарутурнай

пары, і засведчым тое, шт насамрэч выказаў паэт у сваіх вершах» (ЛіМ, 12 снежня 2003 г.);

- звярнуць увагу чытача з мэтай актывізаваць яго, выклікаць пэўныя адносіны да названых фактаў, рэакцыю на паведамлене: «Ведаеце, калі ў хмельнай маладосці быць трэцім лічылася за ўдачу, то сёння, у дні цвярозага розуму, апынуўшыся чацвёртым, пачуваеш сябе лішнім…» (ЛіМ, 12 снежня 2003 г.).

- Памкненне крытыкаў пазбегнуць афіцыйнасці, уніфікаванасці газетнай мовы выклікала змены ў складзе газетнага маўлення. Перш за ўсё гэта выразілася ў імкненне крытыкаў наблізіць стыль артыкулаў да гутарковага. З гэтай мэтай яны нярэдка выкарыстоўваюць прастамоўе, жарганізм, як спосаб перадачы экспрэсіі.

- У крытычных творах Леаніда Галубовіча таксама назіраецца працэс «дэмакратызацыі» моўных сродкаў. ЛеГал звяртаецца да такой лексікі ў некалькіх выпадках:

- калі піша пра моладзь і для моладзі: «Магчыма маладыя літаратары-авангардысты скажуць мне: ды ачуйся ты, дзядзька сур’ёзны, гэта ж натуральны мастацкі прыкол!» (ЛіМ, 5 сакавіка 2004 г.); «Ну, не хапала мне яшчэ каментаваць падобныя бздуры юнага словапісацеля, які чамусьці хаваецца пад псеўданімам» (тамсама); «Няхай хлопцы дурэюць, пішуць, практыкуюцца» (тамсама);

- з мэтай найбольш эмацыйнага праяўлення свайго ці то пазітыўнага стаўлення да аўтара (твора), ці то, наадварот (што адбываецца часцей), – негатыўнага: «Хоць і трагедыя ў натуры, але ж лажа несусветная» (ЛіМ, 9 студзеня 2004 г.);

- калі хоча падкрэсліць іранічнасць выказвання, або пасмяяцца з самога сябе: «Не паспела й фарба друкаская на тым «ЛіМе» абсохнуць, дзе я на адлуп напрошваўся, як з-за вугла памяркоўныя людзі і ўдарылі» (тамсама); «Вось парадокс! Пішаш, пішаш, крытыкуеш гэтых няшчасных беларускіх вершаскладальнікаў, а яны – не, каб агрызнуцца «ды ў пысу» але, – хочаце верце, хочаце не – нават цёпла са мной рукаюцца пры сустрэчы і дасылаюць свае новыя зборнікі для рубрыкі «ЛеГалізацыя»…» (30 студзеня 2004 г.).

Творчая манера Л. Галубовіча прыцягвае сваёй неадназначнасцю, месцамі – арыгінальнасцю, часам паспешлівасцю ў выкарыстанні прастамоўнай лексікі. Відавочна адно: стылістычныя асаблівасці твораў Л. Галубовіча паказваюць на значную ступень перасаніфікаванасці яго крытычных тэкстаў, што можа стаць удзячным падмуркам для аналітычнага апісання стану сучаснай літаратурнай крытыкі, эвалюцыі

моўных сродкаў, якімі карыстаюцца крытыкі, а таксама вызначэння месца асобы крытыка ў сучасным літаратурным працэсе.

**Літаратура**


2. *Выровцева К.* Текст СМИ как проявление личности журналиста // Журналістыка-2004: Матэрыялы 6-й Міжнар. навук.-практ. канф. Вып. 6. Рэдкал. В. П. Вараб'ёў (адк. рэд.) і інш. Мн.: БДУ, 2004. С. 90–92.
3. *Ивченков В. И.* Лингвистическая организация текста: В творческой лаборатории Владимира Короткевича / Мн.: БГУ, 2002. 211 с.


## СТУДЕНЧЕСКАЯ ПЕЧАТЬ В СИСТЕМЕ СМИ


**Д. Г. Прищепова**


Студенты всегда были активными и удивляли своей безудержной энергией. Новое время – новые правила. Молодежь на «ты» с техникой. Вполне логичным становится появление на белорусском пространстве студенческих СМИ (газеты, интернет-сайты, радиостанции, а иногда и видеостудии). Это явление становится неотъемлемым сектором студенческой занятости.

Думаю (или надеюсь), что сегодня студенческую печать можно назвать вполне самостоятельным компонентом системы СМИ. Основание для выделения этого сектора даже из молодежной прессы – читатель – одна из типоформирующих примет. Здесь – студенческая молодежь. Нет практически ни одного учебного заведения, где бы не выходило свое издание.

Студенческие СМИ имеют в обществе ряд важных функций.

Так, например, они осуществляют обратную связь между администрацией ВУЗа и студентами.

Студенческие СМИ – зеркало университета. От того, насколько объективно журналисты отражают прошедшие мероприятия, во многом зависит мнение читателя о жизни ВУЗа целиком.

Студенческие СМИ – лакмусовая бумажка. Именно благодаря им можно своевременно предупредить или предотвратить негативные явления в студенческом окружении.

Студенческие СМИ – средство единения всех, кто связан с этим университетом (факультетом).

В конце концов, студенческие издания – средство отдыха. Особенно, если есть, на чем посмеяться в реальной жизни. Самые смешные анекдоты – жизненные анекдоты.

Тем не менее обращусь подробней к студенческой печати.